# FORUM NUMIZMATYCZNE

## Studia i Materiały
## № 3

Pod redakcją naukową
Krzysztofa Filipowa

Białystok 2019

Rada Redakcyjna:
Aleksandr Bugrov (Rosja),Krzysztof Filipow (Polska)
Wiktor Kakareko (Białoruś), Valerij Kapeliusznij (Ukraina)
Maciej Karczewski (Polska),Viktor Kotzur (Ukraina), Vasyl Orlyk (Ukraina)
Stanislovas Sajauskas (Litwa), Andrzej Suchcitz (Anglia)
Zbysek Sustek (Słowacja), Stefan Samoila (Rumunia)

Kolegium Redakcyjne:
Redaktor Naczelny: Krzysztof Filipow
Sekretarz Redakcji: Barbara Kuklik

Recenzenci:
Prof. dr hab. Valerij Lastovsky (Ukraina)
Narodowy Uniwersytet Kultury I Sztuki w Kijowie
Prof. dr Aleksandr Bajura (Białoruś)
Państwowy Uniwersytet Techniczny w Brześciu

Seria: Forum Numizmatyczne

Redakcja Naukowa: Krzysztof Filipow

Korekta: Zespół i Autorzy

Projekt okładki i opracowanie techniczne: Barbara Kuklik

Tłumaczenia: Autorzy i Krzysztof Filipow

Foto na okładce: Skarb „miejski" z Mińska
ze zbiorów Muzeum Historii Białorusi w Mińsku

Publikacja dofinansowana przez Wydział Historyczno-Socjologiczny
i Instytut Historii i Nauk Politycznych Uniwersytetu w Białymstoku

Wszelkie prawa zastrzeżone
Żadna część tej publikacji nie może być reprodukowana i wykorzystywana
w jakiejkolwiek postaci i formie bez wyrażenia pisemnej zgody wydawcy

Wydawca: Ośrodek Badań Europy Środkowo-Wschodniej

ISBN 978-83-950711-0-2

Nakład: 100 egzemplarzy
Copyright by Autorzy i Ośrodek Badań Europy Środkowo-Wschodniej
Białystok 2019

**Дзьмітрый Мацеша**
**(Беларусь)**

## АБ НОВЫХ ЗНАХОДКАХ ПОЛЬСКІХ ЛІЧМАНАЎ

У апошні час усё часцей сустракаюцца знаходкі такіх рэдкіх прадметаў, як лічманы. У гэтай сувязі пабачыла свет мноства публікацый, прысвечаных гэтай тэме. У рамках гэтага артыкулу маем жаданне прывесці інфармацыю пра знаходкі польскіх лічманаў па-за межамі тэрыторыі Польшчы – у Беларусі, Летуве ды Расіі (Табліца, Малюнак 11). Прычыны, па якіх польскія лічманы трапілі на тыя ці іншыя тэрыторыі, пакуль дакладна невядомыя. Разам з тым, спадзяемся, што дадзеная інфармацыя ў далейшым паслужыць дзеля высвятлення дадзеных абставінаў. Таксама прапануем ў рамках гэтай публікацыі больш падрабязна разгледзець новую разнавіднасць лічмана Габрыэля Тарло, якая не сустракаецца ў каталогах Б.Дэмеля, К.Дрожджа і Е.Іванаўскаса, а таксама новыя асобнікі рэдкіх подскарбювак Яцэка Младзеёўскага і Яна Дульскага.

**Табліца**

| Мал. | Эмітэнт | Пасада | Д-р., mm | Год | Мынца | Drożdż | Месца знаходкі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Ян Лютамірскі | Падскарбі надворны каронны 1548-1567 г. | н.д. | 1551 | Вільня | №2 | Беларусь, Гродзенская вобл., Валкавыскі район |
| 2 | Ян Лютамірскі | Падскарбі надворны каронны 1548-1567 г. | н.д. | 1551 | Вільня | №2 | Беларусь? |
| 3 | Ян Лютамірскі | Падскарбі надворны каронны 1548-1567 г. | 24 | 1554 | Вільня | №5 | Беларусь, Віцебская вобл., Полацкі район, побач з в. Варонічы |
| 4 | Габрыэль Тарло | Кіраўнік Віленскай мынцы 1562-1565 г. | 25 | 1564 | Вільня | не апісаны | Беларусь, Брэсцкая вобл., Іванаўскі раён, побач з в.Моладава |
| 5 | Пётр Мышкоўскі | Падканцлер каронный 1562-1569 г. | 23 | 1565 | Вільня | №26 | Беларусь, Гродзенская вобл., Шчучынскі раён, побач з в.Старая спуша |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 6 | Пётр Мышкоўскі | Падканцлер каронный<br><br>1562-1569 г. | 23,6 | 1565 | Вільня | №26 | Беларусь?<br><br>Паходзіць са збораў Дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея у Гродна (уліковы нумар КП – 10235/40), набыты у 1955 г. |
| 7 | Пётр Мышкоўскі | Падканцлер каронны<br><br>1562-1569 г. | 24 | 1565 | Вільня | №26 | Летува, Віленскі ўезд, побач с в.Міхалікі |
| 8 | Яцэк Младзеёўскі | Падскарбі надворны каронны<br><br>1580-1604 г. | 25 | 1580 | Вільня | №40 | Беларусь, Гродзенская вобл., Астравецкі раён, побач з в.Рымдзюны |
| 9 | Ян Дульскі | Падскарбі вялікі каронны<br><br>1580-1590 г. | 27 | - | Олькуш | №50 | Расія, Смаленская вобл., Холм-Жыркоўскі раён, побач з в.Сцешына |
| 10 | Мікалай Фірлей | Ваявода Кракаўскі ад 1589 г. | 27 | 1593 | Мальбарк | №68 | Беларусь, Гродзенская вобл., Карэліцкі раён, побач з в.Аюцэвічы |

На Малюнку 4 мы бачым новую разнавіднасць лічмана Габрыэля Тарло, кіраўніка Віленскай мынцы (1555–1565), які мае адрозненне ад раней апісаных асобнікаў у вонкавым выглядзе – дадатковую літару «А» у легендзе. Жэтон был знойдзены не пазней за 2015 г. у Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці побач з в.Моладава. На жэтоне прысутнічае адтуліна. Аверс: у ўпрыгожаным сумётам з лісця шчыце герб «Тапор», уверсе рыцарскі шалом, над нім кляйнот у выглядзе дзьвух крылаў, паміж німі тапор, уваткнуты ў бок левага крыла, вакол шнуравідная абводка і вянок з кветак лілеі. Рэверс: па крузе надпіс: ✚ GAB(rielius) ⭘TARLO ⭘ CAS(tellanus) ⭘ RAD(omiensis) ⭘ S(acrae) ⭘ R(egiae) ⭘ M(ajestatis) ⭘ CV(linae) ⭘ M(a)G(iste)R ⭘ C(helmensis) ⭘ CA(pitaneus) (лац.: Габрыэль Тарло, кашталян Радомскі, кухмістр двара яго Каралеўскай вялікасці, стараста Хелмінскі), у цэнтры: ALLES ● / ● ZV ● SEIN / ER ● ZEIT (ням.: усяму свой час) / ANNO ● /●1564●.

Новы асобнік рэдкай падскарбюўкі падскарбія надворнага кароннага (1580-1604) Яцэка Младзеёўскага (Малюнак 8) быў знойдзены ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці. Аверс: у ўпрыгожаным сумётам з лісця шчыце герб «Слепварон», уверсе рыцарскі шалом, над ім кляйнот - птушка з пярсцёнкам ў дзюбе, вакол шнуравідная абводка, далей абводка з кветак лілеі, другая шнуравідная абводка і жамчужная

абводка. Рэверс: надпіс (захаваўся часткова): ❧ HIACIN ○ MLODZIEIOWSKI ○ THES(aurarius)/○ CURIÆ○ R(egiae) (лац.: Хіацын Младзеёўскі падскарбі надворны каралеўскі) у абводцы з кветак лілеі надпіс: 1580/VIRTVS/HONORIS/VES[TI]BV/LVM (лац.: дабрачыннасць папярэднічае гонару).

Яшчэ адзін асобнік падскарбюўкі падскарбія вялікага кароннага (1580-1590) Яна Дульскага (Малюнак 9) быў знойдзены ў 2017 г. у Смаленскай вобласці Расіі. Пасярэдзіне жэтона знаходзіцца адтуліна. Аверс: у шнуравіднай абводцы ў упрыгожаным сумётам з лісця шчыце герб «Пшэгоня», уверсе рыцарскі шалом, над ім кляйнот - цмок які трымае ў пашчы герб Przegonia, вакол абводкі надпіс: IOANES DVLSKI CASTEL(lanus) COLMEN(sis) (лац.: Ян Дульскі кашталян Хелмінскі). Рэверс: у абводцы ў квадратным картушы, ўпрыгожаным раслiннымі матывамі, надпіс: REGNI POLONI(ae) TERRARVMQ(ue)Z PRVSSIAE THES(aurarius) AVRANVS BRAN(scensis) ROGENH(ausensis) SVRA(siensis) ET SVECIAE EG CAPITANENI.

Аўтар выказвае падзяку ўсім, хто аказаў дапамогу ў падрыхтоўцы дадзенага артыкула. Інфармацыю пра знаходкі лічманаў (месца, час, склад знаходкі, фота, дыяметр і вага лічэбных жэтонаў) можна даслаць аўтару на электронную скрыню: ozcoin@mail.ru

**ЛІТАРАТУРА***:*


1. Demel, B. Liczmany mennicze zwane podskarbiowkami. – Kraków, 1911.
2. Drożdż, K. Podskarbiówki i liczmany Rzeczypospolitej Oboiga Narodów i z Rzeczypospolita powiazane. – Warszawa, 2014.
3. Ivanauskas, E. Lietuviški skaičiavimo žetonai 1546–1615. – Kaunas, 2014.
4. Kurowski, W. Dwutygodnik literacki. Tom I. Opis dwóch rzadkich medali polskich. – Kraków, 1844. – S.23-26.
5. Зяньковіч, У. Старонкі з гісторыі лічманаў. Калекцыянер: зборнік артыкулаў. – Мінск, 2014. – С.110–119.
6. Матеша, Д. Счетные жетоны XVI–XVII вв. в собраниях на территории Беларуси / Банкаўскі веснік – Мінск, 2018. – №2 (655) люты 2018. – С.24-28.


Малюнак 1



Малюнак 2



Малюнак 3



Малюнак 4



Малюнак 5



Малюнак 6



Малюнак 7



Малюнак 8



Малюнак 9



Малюнак 10



Малюнак 11: тапаграфія знаходак польскіх лічманаў




**Nowe znaleźće liczmanów polskich**

Artykuł zawiera informacje o nowych egzemplarzach polskich lichmanów znalezionych w sąsiednich z Polską krajach.

## O NOWYCH ZNALEZISKACH POLSKICH LICZMANÓW

**Streszczenie**

Nowe znaleziska polskich liczmanów (5 egz.) pochodzi z terytorium Białorusi. Wśród nich znajduje się jeden dotychczas nie notowany w literaturze Gabriela Tarły z 1564 r. z mennicy wileńskiej. Pozostałe, z tejże mennicy, to liczmany Jana Lutomirskiego (3) oraz Piotra Myszkowskiego (1). Odnaleziono je województwach: grodzieńskim, witebskim, brzeskim i jednym miejscu nieokreślonym.